УА ―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Факультэт дадатковай адукацыі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар БДУКМ
________________ Ю.П.Бондар
―___” _________________2012 г.

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

# Бібліяграфазнаўства

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
1-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія
кваліфікацыя: *бібліятэкар-бібліёграф*
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным 03.11.2010 г., рэг.№ 25-17/189

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

Распрацоўшчыкі праграмы:

Т.В.Кузьмініч, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

В.І.Саітава, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна – дакументных камунікацый установы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэкамендавана да зацвярджэння:

Саветам факультэта дадатковай адукацыі УА ―Беларускі дэяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол паседжання ад ____________ № ______

Навукова – метадычным саветам УА ―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол паседжання ад ____________ № ______

# УВОДЗІНЫ

Вучэбная дысцыпліна “Бібліяграфазнаўства” з’яўляецца абавязковай для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі. Неабходнасць вывучэння гэтай дысцыпліны абумоўлена фундаментальнай роляй тэарэтыка-бібліяграфічных ведаў у фарміраванні прафесіянальнага светапогляду слухачоў, здольнасцей аналізаваць і абагульняць розныя бібліяграфічныя з’явы, уменняў прагназаваць як бібліяграфічную дзейнасць у цэлым, так і асобныя яе кірункі.

Мэтай дысцыпліны “Бібліяграфазнаўства” з’яўляецца вывучэнне слухачамі тэарэтычных асноў бібліяграфіі як сістэмы відаў дзейнасці, якія забяспечваюць функцыянаванне бібліяграфічнай інфармацыі ў грамадстве.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае кола задач, а менавіта:

раскрыць прычыны ўзнікнення бібліяграфіі, яе ролю ў інфармацыйным забеспячэнні грамадства ў асобныя гістарычныя перыяды;

вызначыць асноўныя гістарычныя перыяды развіцця сусветнай бібліяграфіі;

вызначыць асноўныя гістарычныя перыяды развіцця беларускай бібліяграфіі ў кантэксце сусветнай бібліяграфіі;

- прасачыць паэтапнае фарміраванне арганізацыйных структур беларускай бібліяграфіі;
- паказаць дасягненні выдатных бібліёграфаў і бібліяграфічных арганізацый;
- паказаць эвалюцыю метадычных падыходаў у фарміраванні бібліяграфічнай прадукцыі;
- тлумачыць шляхі тэарэтычнага асэнсавання бібліяграфіі;
- раскрываць значэнне і кірункі міжнароднага бібліяграфічнага супрацоўніцтва;
- разумець змест і значэнне міжнародных бібліяграфічных і інфармацыйных праграм.

У выніку вывучэння дысцыпліны "Бібліяграфазнаўства" слухачы павінны ведаць:

— сутнасць бібліяграфіі, законы і заканамернасці, функцыі і прынцыпы бібліяграфіі і бібліяграфічнай інфармацыі;
— унутраных і знешніх фактарах, якія ўздзейнічаюць на развіццё бібліяграфічнай інфармацыі і бібліяграфічнай дзейнасці;
— інфармацыйных патрэбнасцях грамадства ў цэлым, асобных яго сацыяльных груп і індывідаў;
— інфармацыйныя бар'еры ў сістэме дакументных камунікацый і ролі бібліяграфіі як сродка іх пераадолення;
— асноўныя тэарэтычныя палажэнні бібліяграфазнаўства; кампанентнаю структуру ббібліяграфічнай практычнай дзейнасці; відавую структуру бібліяграфіі 1 бібліяграфічнай прадукцыі; аспектную і аб'ектную структуры бібліяграфазнаўства;
— асноўныя этапы і метады складання бібліяграфічных дапаможнікаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічнага абслугоўвання;
— стварэння і ўспрымання разнастайных бібліяграфічных паведамленняў.

Умець:

— выкарыстоўваць тэарэтычныя веды ў прафесійнай практычнай і навуковай дзейнасці;
— аналізаваць і сістэматызаваць бібліяграфічную прадукцыю для класіфікацыі па формах, тыпах, жанрах, відах;
— выкарыстоўваць бібліяграфічную прадукцыю у бібліяграфічным абслугоўванні;
— складаць і ўспрымаць бібліяграфічныя паведамленні;
— карыстацца бібліяграфічнымі ведамі ў непрадбачанных прафесійных і жыццёвых абставінах;
— праводзіць параўнальны аналіз і ацэнку розных тэарэтычных канцэпцый у бібліяграфазнаўстве з мэтай выкарыстання бібліяграфічных ведаў у прафесійнай дзейнасці.

У працэсе выкладання курса будуць выкарыстоўвацца наступныя педагагічныя методыкі і тэхналогіі:

— тэхналогія модульнага навучання;
— тэхналогія праблемнага навучання;
— камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі і інш.);
— інфармацыйныя тэхналогіі (лекцыя - аўдыёвізуалізацыя);
— тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
— метад аналіза канкрэтных сітуацый.

Паспяховае засваенне слухачамі дысцыпліны "Бібліяграфазнаўства" магчыма на аснове трывалых ведаў, атрыманых пры вывучэнні цыкла агульнапрафесійных дысцыплін.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны ―Бібліяграфазнаўства” прадугледжваецца 64 гадзіны, з іх 32 – аўдыторныя заняткі (лекцыі – 24, семінарскія – 8), 32 гадзіны самастойная работа.

Форма выніковага кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практычныя заняткі | самастойная работа |
| Уводзіны | 1 | 1 | | |
| **Раздзел І. АСНОВЫ ТЭОРЫІ БІБЛІЯГРАФІІ** | | | | |
| Тэма 1. Бібліяграфія як грамадская з’ява | 5 | 1 | 2 | 2 |
| Тэма 2. Бібліяграфічная інфармацыя як асноўнае паняцце тэорыі бібліяграфіі | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 3. Формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі | 8 | 2 | | 6 |
| Тэма 4. Функцыянальная структура бібліяграфіі | 4 | 2 | 2 | |
| **Раздзел ІІ. БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ** | | | | |
| Тэма 5. Бібліяграфія як галіна дзейнасці | 4 | 2 | 2 | |
| Тэма 6. Бібліяграфічная практычная дзейнасць: паняцце і структура | 10 | 2 | | 8 |
| Тэма 7. Кампанентная структура бібліяграфічнай дзейнасці | 8 | 4 | | 4 |
| Тэма 8. Відавая класіфікацыя бібліяграфіі | 8 | 4 | | 4 |
| **Раздзел ІІІ. БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА – НАВУКА АБ БІБЛІЯГРАФІІ** | | | | |
| Тэма 9. Бібліяграфазнаўства як сістэма навуковых ведаў | 2 | 2 | | |
| Тэма 10. Развіццё бібліяграфазнаўства на сучасным этапе | 8 | 2 | 2 | 4 |
| Усяго | 64 | 24 | 8 | 32 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## УВОДЗІНЫ

―Бібліяграфазнаўства” як навуковая і вучэбная дысцыпліна. Задачы і змест курса. Яго месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў. Тэорыя бібліяграфіі ў вучэбным цыкле бібліяграфічных дысцыплін. Агульнае і прыватнае бібліяграфазнаўства. Тэорыя, гісторыя, арганізацыя, метадалогія і методыка бібліяграфіі. Фундаментальны характар тэорыі бібліяграфіі ў адносінах да іншых бібліяграфічных дысцыплін. Сувязь тэорыі бібліяграфіі з дысцыплінамі агульнапрафесійнага цыкла; гісторыяй кнігі, дакументалогіяй, бібліятэказнаўствам, інфарматыкай; тэорыяй інфармацыі і камунікацыі, асновамі інфармацыйных тэхналогій; культурай асобы і інш.

Характарыстыка асноўнай вучэбнай, вучэбна-метадычнай, нарматыўнай, даведачнай літаратуры, спецыяльных часопісаў у дапамогу засваенню дысцыпліны. Асноўныя формы аўдыторнай і пазааўдыторнай работы пры вывучэнні курса. Асноўныя формы кантролю: бягучыя, прамежкавыя і выніковыя.

## Раздзел I. АСНОВЫ ТЭОРЫІ БІБЛІЯГРАФІІ

### Тэма 1. Бібліяграфія як грамадская з’ява

Паняцце ―бібліяграфія”, яго этымалогія і генезіс. Шматзначнасць сучаснага выкарыстання тэрміна ―бібліяграфія”.

Заканамернасць узнікнення бібліяграфічных звестак як неад’емнай часткі дакумента. Бібліяграфія ў структуры інфармацыйных рэсурсаў грамадства. Грамадскія патрэбнасці ў інфармацыі, ведах як важнейшая перадумова функцыянавання бібліяграфіі як грамадскай з’явы.

Паняцце аб метасістэме існавання бібліяграфіі як грамадскай з’явы. Сістэма дакументных камунікацый (дакумент – спажывец) як метасістэма існавання бібліяграфіі як грамадскай з’явы. Асноўныя элементы і іх характарыстыка. Супярэчлівасці ці інфармацыйныя бар’еры паміж дакументаванай інфармацыяй і карыстальнікамі. Роля бібліяграфіі ў іх пераадоленні (канцэпцыя А.П. Коршунава).

Свет тэкставых камунікацый (свет тэкстаў – свет карыстальнікаў), універсум чалавечых ведаў, як метасістэмы існавання бібліяграфіі. Асноўныя элементы і іх характарыстыка. Роля бібліяграфіі ў свеце тэкставых камунікацый, універсуме чалавечай дзейнасці (канцэпцыі В.А. Факеева і Н.А. Слядневай).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фактары ўздзеяння на развіццё бібліяграфіі як грамадскай з’явы і фарміраванне яе асноўных элементаў. Заканамернае павелічэнне аб’ёму інфармацыйных рэсурсаў грамадства, ускладненне інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў, паскарэнне інфармацыйных працэсаў у грамадстве, стварэнне новых інфармацыйных тэхналогій, з’яўленне новых відаў носьбітаў інфармацыі і асаблівасці развіцця бібліяграфіі. Уздзеянне на бібліяграфію гісторыка-культурных, сацыяльна-эканамічных умоў існавання грамадства.

## Тэма 2. Бібліяграфічная інфармацыя як асноўнае паняцце тэорыі бібліяграфіі

Бібліяграфічная інфармацыя як разнавіднасць сацыяльнай інфармацыі і як крытэрый (прынцып) адмежавання бібліяграфічных з’яў ад небібліяграфічных.

З’яўленне паняцця ―бібліяграфічная інфармацыя” ў тэрмінасістэме кнігазнаўства, бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства. Уключэнне яго ў слоўнікі, тэрміналагічныя і тэхналагічныя стандарты. Развіццё тэарэтычных поглядаў на аб’ём паняцця ―бібліяграфічная інфармацыя”. Дыскусія 80-х гадоў XX ст. аб сутнасці бібліяграфічнай інфармацыі. Ю.М.Лаўфер аб другаснай навуковай і бібліяграфічнай інфармацыі. А.В.Сакалоў аб бібліяграфічнай інфармацыі як разнавіднасці фактаграфічнай інфармацыі. А.П.Коршунаў аб бібліяграфічнай інфармацыі як інфармацыі другаснай, адасобленай ад дакумента.

Бібліяграфічная інфармацыя і бібліяграфічныя веды. Погляды В.А.Факеева на бібліяграфічныя веды як сродак пазнання, камунікацыі, каштоўнаснай арыентацыі, рэгулявання і кіравання. Структура бібліяграфічных ведаў: аб’ектная і суб’ектная, фармальная і змястоўная, прасторавая і часавая, колькасная і якасная.

Погляды Н.А.Слядневай на сутнасць бібліяграфічнай інфармацыі. Непарыўная сувязь бібліяграфічнай інфармацыі з тэкстам і адчужанасць ад яго. Прагнозная, латэнтная, афінная, постэдзіцыйная бібліяграфічная інфармацыя (бібліяграфія).

Асноўныя якасці бібліяграфічнай інфармацыі. А.П.Коршунаў, В.А.Факееў, Н.А.Сляднева аб якасцях бібліяграфічнай інфармацыі як пасрэдніка ў сістэме дакументных камунікацый, універсуме чалавечай дзейнасці, свеце тэкставых камунікацый.

## Тэма 3. Формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі

Абумоўленасць формаў прадстаўлення бібліяграфічнай інфармацыі культурным, навуковым, тэхналагічным узроўнямі развіцця грамадства.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліяграфічнае паведамленне як элемент бібліяграфічнай інфармацыі. Асноўныя формы, структура і прызначэнне бібліяграфічнага паведамлення. Бібліяграфічны запіс як фіксаваная форма існавання бібліяграфічнага паведамлення і структурная адзінка любога бібліяграфічнага дапаможніка (бібліяграфічнага дакумента). Структура бібліяграфічнага запісу: бібліяграфічнае апісанне як мінімальна неабходная частка бібліяграфічнага запісу, анатацыя, рэферат, прадметная рубрыка, ключавыя словы. Класіфікацыйны індэкс. Сігла бібліятэкі. Бібліяграфічныя звесткі як крыніца фарміравання стандартных элементаў бібліяграфічнага апісання.

Бібліяграфічны дапаможнік як асноўны спосаб існавання і сродак распаўсюджвання дакументаванай бібліяграфічнай інфармацыі. Паняцці бібліяграфічны дапаможнік і бібліяграфічны дакумент, іх месца у структуры дакументных рэсурсаў грамадства. Бібліяграфічны дакумент як асноўная адзінка бібліяграфічных рэсурсаў грамадства.

Формы існавання бібліяграфічных дапаможнікаў: карткавыя, друкаваныя, несамастойныя выдавецкія формы, электронныя.

Тыпы бібліяграфічных дапаможнікаў: бібліяграфічны паказальнік, бібліяграфічны спіс, бібліяграфічны агляд, дапаможны паказальнік, паказальнік да выдання. Жанры бібліяграфічных дапаможнікаў: бібліяграфічная манаграфія, пуцевадзіцель па літаратуры, бібліяграфічны даведнік, біябібліяграфічны слоўнік, бібліяграфічная энцыклапедыя, план чытання, экспрэс-інфармацыя, рэфератыўны часопіс, рэфератыўны зборнік, бібліяграфічны нарыс, памятка, праспект, бібліяграфічная анталогія і інш.

## Тэма 4. Функцыянальная структура бібліяграфіі

Функцыя як знешняе праяўленне якасцей аб’екта. Функцыянальнае прызначэнне бібліяграфіі як выяўленне мэт бібліяграфічнай дзейнасці. Канцэпцыі функцыянальнай ―дапаможнасці” і ―самастойнасці” бібліяграфіі (бібліяграфічнай інфармацыі) як грамадскай з’явы.

Двaістасць бібліяграфічнай інфармацыі як адлюстраванне двaістасці адносін ―дакумент – спажывец інфармацыі”. Інфармацыйныя, дакументальныя і бібліяграфічныя патрэбнасці і іх суадносіны. Дакументальныя патрэбнасці як падстава суадносін паміж дакументамі і спажыўцамі. Механізм фарміравання бібліяграфічных патрэбнасцей. Дакументальна-бібліяграфічныя патрэбнасці. Агульныя, групавыя і індывідуальныя дакументальна-бібліяграфічныя патрэбнасці. Адпаведнасці паміж асноўнымі дакументальна-бібліяграфічнымі патрэбнасцямі і асноўнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характарыстыкамі дакументаў. Асноўныя грамадскія функцыі бібліяграфіі. Генетычная і лагічная функцыянальныя структуры бібліяграфічнай інфармацыі і бібліяграфіі як грамадскай з'явы.

Дыскусія 80-х гадоў XX ст. аб функцыях бібліяграфічнай інфармацыі. Знешнія і ўнутраныя функцыі бібліяграфічнай інфармацыі.

В.А.Факееў аб функцыях бібліяграфічнай інфармацыі (ведаў). Бібліяграфічныя веды як сродак пазнання фіксаваных тэкстаў і бібліяграфічных патрэбнасцей карыстальнікаў. Бібліяграфічныя веды як сродак тэкставай камунікацыі, каштоўнаснай арыентацыі, рэгулявання і кіравання.

Пункт гледжання Н.А.Слядневай на функцыянальную структуру бібліяграфічнай інфармацыі. Бібліяграфічная інфармацыя як сродак аперыравання суверэннымі інфааб'ектамі.

## Раздзел II. БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

### Тэма 5. Бібліяграфія як галіна дзейнасці

Бібліяграфічная дзейнасць ў сістэме відаў чалавечай дзейнасці. З'яўленне бібліяграфічнай дзейнасці як заканамерны этап фарміравання сістэмы дакументных камунікацый.

Паняцце ―бібліяграфічная дзейнасць" у тэрмінасістэме бібліягра-фазнаўства, яго генезіс, уяўленне аб ім у канцэпцыях розных аўтараў, тэрміналагічных слоўніках, стандартах. Суадносіны гэтага паняцця з паняццем ―бібліяграфія". Сістэмна-дзейнасная канцэпцыя бібліяграфіі. Асноўныя спосабы структурызацыі бібліяграфічнай дзейнасці (яе сістэматызацыя, класіфікаванне і перыядызацыя). А.П.Коршунаў аб бібліяграфіі як сістэме відаў дзейнасці. Бібліяграфічная практычная дзейнасць, бібліяграфічная навукова-даследчая дзейнасць, бібліяграфічная педагагічная і вучэбная дзейнасць, бібліяграфічная ўпраўленчая дзейнасць. М.Г.Вохрышава аб бібліяграфіі і бібліяграфічнай дзейнасці. Бібліяграфічная практыка і пазнанне.

Прынцыпы і заканамернасці бібліяграфічнай дзейнасці як аснова яе ўвасаблення ў грамадскай практыцы. Прынцыпы метадалагічнага характару. Прынцыпы тэхналагічнага характару.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 6. Бібліяграфічная практычная дзейнасць: паняцце і структура

Бібліяграфічная практыка як асноўны кампанент бібліяграфічнай дзейнасці. Узнікненне бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Развіццё бібліяграфічнай практыкі, ускладненне яе арганізацыйных формаў і метадычных прыёмаў. Асноўныя рысы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці: прадметнасць, сацыяльная абумоўленасць, мэтазгоднасць, суб'ектыўнасць.

Эвалюцыя навуковых поглядаў на сутнасць бібліяграфічнай практычнай дзейнасці: працэсуальны (абмежавальна-працэсуальны, пералічальна-працэсуальны), асобасны, комплексны, дзейнасны, сістэмна-дзейнасны падыходы.

Бібліяграфічная практыка як вобласць дзейнасці па стварэнні і давядзенні бібліяграфічнай інфармацыі да карыстальнікаў і праз гэта задавальненне і ўзвышэнне іх патрэбнасцей у дакументах бібліяграфічнымі сродкамі.

Структурызацыя бібліяграфічнай практычнай дзейнасці: унутраны і знешні ўзроўні. Кампанентная (унутраная) структура бібліяграфічнай практыкі. Непарыўная сувязь суб'екта, мэты, аб'екта, працэсаў, сродкаў і рэзультатаў (вынікаў) бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Відавая структура і асноўныя напрамкі рэальнага ўвасаблення з'яў бібліяграфічнай практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 7. Кампанентная структура бібліяграфічнай дзейнасці

*Суб'ект* бібліяграфічнай дзейнасці як яе асноўны сістэмаўтваральны кампанент. Яго сувязі з іншымі кампанентамі. Функцыі, выконваемыя суб'ектам у сістэме бібліяграфічнай практычнай дзейнасці: кіруючая, аксіялагічная, камунікатыўная. Прафесійны і непрафесійны, індывідуальны і калектыўны ўзроўні суб'ектаў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Бібліёграф-прафесіянал як асноўны суб'ект бібліяграфічнай дзейнасці. Псіхалагічныя якасці бібліёграфа. Веды, уменні і навыкі бібліёграфа. І.Г. Маргенштэрн аб кодэксе прафесійнай этыкі бібліёграфа. Бібліяграфічная практыка як сістэма суб'ектна-суб'ектных адносін: бібліёграф – карыстальнік, бібліёграф – бібліёграф, карыстальнік – карыстальнік. Бібліяграфічныя зносіны як узаемадзеянне людзей з мэтай абмену бібліяграфічнай інфармацыяй.

*Мэта* як ідэальны структурны кампанент бібліяграфічнай дзейнасці. Мэты як рэгулятары дзейнасці, іх сувязь з эфектыўнасцю бібліяграфічных сістэм. Суадносіны мэт і функцый. Іерархічная структура мэт. Агульныя і прыватныя, знешнія і ўнутраныя, бліжэйшыя і канчатковыя, нарматыўныя і варыятыўныя мэты бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

*Аб’ект* як адзін з кампанентаў бібліяграфічнай дзейнасці. Сістэма дакумент – карыстальнік як адзіны аб’ект бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

Дакументы як непасрэдныя аб’екты бібліяграфавання. Пашырэнне ўяўлення аб аб’екце бібліяграфічнай дзейнасці ў ідэадакументаграфічнай і когнітаграфічнай канцэпцыях бібліяграфіі (інфааб’екты, тэксты). Выяўленне, бібліяграфічны аналіз, бібліяграфічная характарыстыка, грунтоўка дакументаў. Упарадкаванне дакументаў як аб’ектаў бібліяграфавання з улікам трох асноўных прымет: форма дакумента, яго змест, мэтавае прызначэнне. Іерархічныя і фасетныя класіфікацыі, прадметныя інфармацыйна-пошукавыя мовы, выкарыстоўваемыя ў сучаснай бібліяграфічнай практыцы.

Карыстальнік бібліяграфічнай інфармацыі як патэнцыяльны (тыповы) аб’ект працэсу бібліяграфавання і непасрэдны ( групавы, індывідуальны) аб’ект бібліяграфічнага абслугоўвання. Суадносіны паняццяў ―карыстальнік”, ―спажывец”, ―чытач”. Патрэбнасці, інтарэсы і запыты карыстальнікаў бібліяграфічнай інфармацыі як аб’екта бібліяграфічнай дзейнасці. Класіфікацыі карыстальнікаў бібліяграфічнай інфармацыі.

*Працэсы бібліяграфічнай дзейнасці*. Спецыфіка бібліяграфічных працэсаў. Эвалюцыя поглядаў на іх наяўнасць і сутнасць. Погляды А.П.Коршунава, М.Г.Вохрышавай, Г.Г.Сямёнавай, С.А.Трубнікава. Бібліяграфічны пошук як зыходная аснова ўсіх бібліяграфічных працэсаў. Асноўныя паняцці, звязаныя з бібліяграфічным пошукам: адшукванне і выяўленне, пошукавая прымета, пошукавае прадпісанне, перцінентнасць, рэлевантнасць, паўната і дакладнасць бібліяграфічнага пошуку. Бібліяграфаванне як працэс стварэння бібліяграфічнай прадукцыі (крыніц бібліяграфічнай інфармацыі), яго ўзаемасувязь з іншымі працэсамі.

*Сродкі* ва ўнутранай структуры бібліяграфічнай дзейнасці. Метады і формы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Метады бібліяграфавання. Метады бібліяграфічнага абслугоўвання. Асноўныя каналы давядзення бібліяграфічнай інфармацыі да карыстальнікаў. Выкарыстанне прадметных, друкаваных і тэхнічных сродкаў у бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Сучасныя камп’ютэрныя сродкі стварэння, перадачы, пошуку і абмену бібліяграфічнай інфармацыяй. Інтэрнет-тэхналогіі.

*Рэзультаты* бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Адпаведнасць і несупадзенне вынікаў і мэт. Задавальненне, пашырэнне і ўзвышэнне грамадскіх патрэбнасцей у бібліяграфічнай інфармацыі як сукупны (агульны) рэзультат

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічнай практычнай дзейнасці і рэалізацыя яе асноўнай мэты. Сувязь рэзультатаў з асноўнымі бібліяграфічнымі працэсамі.

М.Г.Вохрышава аб асноўных і дадатковых выніках працэсаў бібліяграфавання, бібліяграфічнага абслугоўвання і выкарыстання бібліяграфічнай інфармацыі. Шматаспектная (блочна-фасетная) класіфікацыя бібліяграфічнай прадукцыі. Бібліяграфічная прадукцыя на электронных носьбітах інфармацыі: праблемы класіфікацыі. Значэнне вынікаў для ацэнкі эфектыўнасці бібліяграфічнай дзейнасці.

## Тэма 8. Відавая класіфікацыя бібліяграфіі

Від бібліяграфіі і відавая класіфікацыя як навуковая праблема. Яе значэнне для развіцця бібліяграфазнаўства. Вырашэнне яе ў межах працэсуальнага, комплекснага, дзейнаснага і сістэмна-дзейнаснага падыходаў. Н.А.Сляднева аб асноўных відах бібліяграфіі (прагнознай, афіннай, латэнтнай, постэдзіцыйнай). А.П.Коршунаў аб патрабаваннях, якім павінна адпавядаць дасканалая відавая класіфікацыя.

*Віды бібліяграфіі па арганізацыйна-ведамаснай прымеце* (інстытуцыянальныя віды бібліяграфіі). Бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць, яе сутнасць, аб’ект, традыцыі, узаемасувязь бібліятэчных і бібліяграфічных працэсаў. Кнігагандлёва-бібліяграфічная дзейнасць, яе сутнасць, аб’ект, традыцыі, абумоўленасць працэсаў, сродкаў і вынікаў задачамі кніжнага гандлю як спецыфічнага інстытута сістэмы дакументных камунікацый. Выдавецка-бібліяграфічная дзейнасць, яе сутнасць, аб’ект, традыцыі, узаемасувязь рэдакцыйна-выдавецкіх і бібліяграфічных працэсаў. Бібліяграфічная дзейнасць кніжных палат (нацыянальных бібліятэк, іншых інфармацыйных установ некаторых краін) па дзяржаўным (нацыянальным) уліку дакументаванай прадукцыі. Бібліяграфічная дзейнасць архіваў, яе сутнасць, аб’ект, традыцыі, адрозненне ад іншых інстытуцыянальных відаў бібліяграфіі. Бібліяграфічная дзейнасць органаў навуковай інфармацыі: спецыфіка, аб’ект, задачы, адрозненне ад іншых інстытуцыянальных відаў бібліяграфіі. Бібліяграфічная дзейнасць сродкаў масавай інфармацыі: асаблівасці стварэння і распаўсюджвання бібліяграфічнай інфармацыі ў друку, на радыё, тэлебачанні, сродкамі тэлекамунікацый.

*Віды бібліяграфіі па аднароднасці ствараемай і распаўсюджваемай бібліяграфічнай прадукцыі* (па грамадскім прызначэнні, функцыянальна-мэтавай прыкмеце, змесце бібліяграфіруемых дакументаў). Віды бібліяграфіі па грамадскім прызначэнні ствараемай і распаўсюджваемай бібліяграфічнай прадукцыі. Агульная і спецыяльная бібліяграфія, іх спецыфіка і сувязь з асноўнымі грамадскімі функцыямі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфіі як грамадскай з’явы. Падвіды агульнай і спецыяльнай бібліяграфіі. Асноўныя варыянты класіфікацыі бібліяграфічнай дзейнасці па грамадскім прызначэнні. Віды бібліяграфіі па функцыянальна-мэтавай прымеце ствараемай і распаўсюджваемай бібліяграфічнай прадукцыі. Бягучая, рэтраспектыўная і перспектыўная бібліяграфія, іх спецыфіка, ўзаемасувязь. Асноўныя патрабаванні, якім павінны адпавядаць крыніцы бягучай, рэтраспектыўнай і перспектыўнай бібліяграфіі. Віды бібліяграфіі па змесце бібліяграфіруемых дакументаў. Універсальная і галіновая бібліяграфія, іх спецыфіка, узаемасувязь. Шматгаліновая, тэматычная, комплексная, персанальная, краязнаўчая, краіназнаўчая як разнавіднасці галіновай бібліяграфіі. Бібліяграфія бібліяграфіі як спецыфічны від бібліяграфіі.

*Дзейнасныя віды бібліяграфіі*. Прафесійная і непрафесійная; індывідуальная і калектыўная; вытворчая і спажывецкая; творчая і рэпрадуктыўная; практычная і тэарэтычная і інш. віды бібліяграфічнай дзейнасці.

## Раздзел III. БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА – НАВУКА АБ БІБЛІЯГРАФІІ

### Тэма 9. Бібліяграфазнаўства як сістэма навуковых ведаў

Бібліяграфазнаўства як сукупнасць навуковых ведаў аб бібліяграфіі і як бібліяграфазнаўчая навуковая дзейнасць суб’екта, накіраваная на пазнанне структуры і якасцей бібліяграфічнай інфармацыі, заканамернасцей яе функцыянавання ў грамадстве.

*Функцыі бібліяграфазнаўства*: інфармацыйная, тлумачальная, эўрыстычная, прагнозная, сінтэзуючая, кумулятыўная.

*Тэрмінасістэма бібліяграфазнаўства*. Яе распрацоўка і ўдасканаленне ў навуковых працах, тэрміналагічных і тэхналагічных стандартах, слоўніках.

Роля прафесійнага друку ў развіцці бібліяграфазнаўства.

*Структура і змест бібліяграфазнаўства*. Аспектны і аб’ектны кірункі дыферэнцыяцыі бібліяграфазнаўства. Асноўныя раздзелы бібліяграфазнаўства згодна аспектнай дыферэнцыяцыі.

Метадалогія бібліяграфазнаўства. Паняцці ―метад”, ―методыка”, ―метадалогія”. Фарміраванне метадалагічнага раздзела бібліяграфазнаўства. Погляды на метадалогію бібліяграфазнаўства як частку тэорыі бібліяграфіі, самастойны раздзел побач з тэорыяй, гісторыяй, арганізацыяй і тэхналогіяй бібліяграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шматузроўневая сістэма метадаў бібліяграфазнаўства. Выкарыстанне філасоўскіх, агульнанавуковых і спецыяльных метадаў пры правядзенні бібліяграфічных даследаванняў. Метады сумежных навуковых дысцыплін і іх выкарыстанне пры правядзенні бібліяграфічных даследаванняў. Спецыяльныя метады бібліяграфазнаўства. Бібліяметрычны аналіз: яго спецыфіка і значэнне для развіцця бібліяграфічнай дзейнасці і правядзення навуковых даследаванняў. Асноўныя параметры бібліяметрычнага аналізу: тэматычны, відавы, геаграфічны, храналагічны, моўны, інстытуцыянальны, аўтарскі. Кантэнт-аналіз.

Тэорыя бібліяграфіі як адна з фундаментальных дысцыплін сучаснага бібліяграфазнаўства. Яе прадмет, задачы, асноўныя працы. Гісторыя бібліяграфіі: прадмет, задачы, асноўныя працы. Значэнне арганізацыйнага і тэхналагічнага раздзелаў бібліяграфазнаўства. як галоўных звёнаў, якія забяспечваюць непасрэдную сувязь паміж бібліяграфічнай навукай і практыкай. Прадмет і задачы –арганізацыі” бібліяграфіі. Тэхналогія і методыка бібліяграфіі. Методыка бібліяграфіі як найбольш старажытны і разгалінаваны раздзел бібліяграфазнаўства, яго прадмет і задачы.

Аб’ектны кірунак дыферэнцыяцыі бібліяграфазнаўства. Бібліяграфічная дзейнасць як найбольш агульны аб’ект бібліяграфазнаўства. Выдзяленне асобных участкаў, вынікаў, працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці і фарміраванне дысцыплін і праблем прыватнага бібліяграфазнаўства.

### Тэма 10. Развіццё бібліяграфазнаўства на сучасным этапе

Дыскусія пачатку 1990-х гадоў аб аб крызісным стане бібліяграфіі, парадыгмах у бібліяграфазнаўстве, метадалогіі бібліяграфазнаўства. В.А.Факееў аб асноўных парадыгмах бібліяграфазнаўства.

Агульная характарыстыка навукова-кнігазнаўчай (пазнавальнай), каштоўнасна-арыенціровачнай (дапаможна-ідэалагічнай), інфармацыйна-камунікатыўнай (дакументаграфічнай), культуралагічнай парадыгм.

Сучасныя канцэпцыі ў бібліяграфазнаўстве. Дакументаграфічная канцэпцыя бібліяграфіі як грамадскай з’явы. А.П. Коршунаў аб метасістэме існавання бібліяграфіі. Асноўныя элементы метасістэмы. Роля бібліяграфічнай інфармацыі.

Когнітаграфічная канцэпцыя бібліяграфіі як грамадскай з’явы. Метадалагічная аснова канцэпцыі. В.А.Факееў аб метасістэме існавання бібліяграфіі. Уяўленне В.А. Факеева аб бібліяграфіі як сацыякультурным комплексе, які ўключае бібліяграфічныя веды (інфармацыю), бібліяграфічны сацыяльны інстытут, бібліяграфічную дзейнасць і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічную культуру, так названы ім “бібліяграфічны квадрат”.Трохузроўневая структура функцый бібліяграфіі. Асноўныя функцыі бібліяграфіі.

Ідэадакументаграфічная (ідэаграфічная) канцэпцыя бібліяграфіі як грамадскай з’явы. Н.А.Сляднева аб метасістэме існавання бібліяграфіі. Асноўныя элементы метасістэмы. Роля бібліяграфічнай інфармацыі. Функцыі бібліяграфічнай інфармацыі.

Духаўна-вытворчая (кагнітыўна-камунікацыйная) канцэпцыя А.В.Сакалова. Метадалагічная аснова канцэпцыі. Асноўныя задачы і катэгорыі бібліяграфіі. Бібліяграфічныя веды як вядучае паняцце бібліяграфіі. Функцыі бібліяграфіі.

Культуралагічная канцэпцыя бібліяграфіі (М.Г.Вохрышава, Н.Б.Зіноўева, Ю.С.Зубаў). Метадалагічная аснова канцэпцыі. Спецыфіка бібліяграфіі ў метасістэме “культура”. Асноўная якасць і найбольш істотныя прыметы бібліяграфіі.

Інфармацыйна-упраўленчая канцэпцыя А.А.Грачыхіна. Метадалагічная аснова канцэпцыі. Метасістэма бібліяграфіі. Спецыфіка бібліяграфіі як галіны інфармацыйнай дзейнасці, яе асноўнае грамадскае прызначэнне.

Навуказнаўчая канцэпцыя Л.В.Астахавай. Бібліяграфічнае пазнанне. Бібліяграфія як навуковы фенамен.

Працэсна-кагнітыўная (кагнітыўна-трансфармацыйная) канцэпцыя В. П. Леонава. Вядучыя катэгорыі. Бібліяграфічная трансфармацыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЕМІНАР № 1 па тэме “БІБЛІЯГРАФІЯ ЯК ГРАМАДСКАЯ З’ЯВА”, 2 гадзіны

***Пытанні для абмеркавання:***

1. Узнікненне бібліяграфіі і асноўныя перыяды яе развіцця:

   1.1. Прычыны ўзнікнення бібліяграфіі (тлумачэнні А.П.Коршунава, Н.А.Слядневай і інш.), з’яўленне тэрміна “бібліяграфія”, эвалюцыя яго сэнсу.

   1.2. Асноўныя перыяды ў станаўленні паняцця “бібліяграфія” і бібліяграфічных з’яў.

2. Роля бібліяграфіі ў розных грамадскіх сферах.

3. Асноўныя ўяўленні аб метасістэме існавання бібліяграфіі:

   1.1.Дакументныя (сацыяльныя) камунікацыі (дакумент – карыстальнік)

   1.2. Тэкставыя камунікацыі (свет тэкстаў – свет карыстальнікаў).

   1.3. Універсум чалавечай дзейнасці (№ 7 а/л).

   1.4. Культура (№ 2 а/л, с.298 – 306).

4. Значэнне бібліяграфіі ў стварэнні грамадства ведаў (№ 9 а/л).

5. Паняцці “бібліграфічная інфармацыя” і “бібліяграфічныя веды”, іх узаемасувязь і адрозненні.

   5.1. Бібліяграфічная інфармацыя як сродак пераадолення інфармацыйных бар’ераў у сістэмах “інфармацыя – чалавек”, “веды – чалавек”, “дакумент – карыстальнік”.

6. Формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі.

   6.1. Гістарычныя формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі (ведаў)/бібліяграфіі (афінная, латэнтная, каталожная, дыягенетычная).

   6.2. Характарыстыка паняццяў “бібліяграфічнае паведамленне”, “бібліяграфічны запіс”, “бібліяграфічны дапаможнік”, “бібліяграфічны рэсурс”.

   6.3. Формы бібліяграфічных дапаможнікаў.

   6.4. Тыпы і жанры бібліяграфічных дапаможнікаў.

***Літаратура***

*Асноўная*


1. Библиотечная энциклопедия / Рос. гос. б-ка. – М. : Пашков дом, 2007. – С.100–102.
2. Вохрышева, М.Г. Теория библиографии / М.Г.Вохрышева. – Самара, 2004. – С. 8 – 21, 27 – 41, 46 – 49, 298 – 306.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. ГОСТ 7.0-99. СИБИД. Информационно-библиотечная деятельность, библиография: Термины и определения. – Введ. 1.06.2000. – Мн.: Белстандарт, 1999. – 23 с.
4. Коршунов, О. П. Библиографоведение. Основы теории и методологии / О.П.Коршунов, Т. Ф. Лиховид, Т. А. Новоженова. –М.: ФАИР, 2011. – 336 с.
5. Кузьмініч Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя: вучэб. дапам. – Мінск : ―Беларусь”, 2012. – 215 с.
6. Левин, Г.Л. Традиционные типы библиографической продукции в электронной среде: проблемы теории и практика российских библиотек / Г.Л.Левин // Библиосфера. – 2010. – № 1. С. 7 – 13.
7. Леонов, В.П. Эволюционный синтез библиографии / В.П.Леонов. – Библиография. – 2011. – № 1. – С.20–29.
8. Сляднева, Н.А. Библиография в системе универсума человеческой деятельности / Н.А.Сляднева // Библиография. – 1992. – № 5 – 6. – С.34 – 43.
9. Соколов, А.В. Незыблемость фундамента и модернизация фасада / А.В.Соколов // Науч. и техн. б-ки. – 2009. – № 4. – С.64 – 75.
10. Теплицкая, А.В. Организация общества знания средствами библиографии / А.В.Теплицкая // Библиография. – 2009. – № 5. – С.14 – 20.
11. Фокеев, В.А. Библиография: теоретико-методологические основания : учеб. пособие / В.А.Фокеев. – СПб., 2006. – С.283 – 292.

*Дадатковая*

1. Коршунов, О.П. Библиографоведение. Общий курс : учебник / О.П.Коршунов. – М., 1990. – С.14 – 35.
2. Коршунов, О.П. Библиографоведение. Общий курс : учебник. В 2 ч. / О.П.Коршунов. – М., 2001. – Ч.1. – С.27 – 54.
3. Коршунов, О.П. Метод, доведенный до абсурда / О.П.Коршунов // Библиография. – 1993. – № 3. – С.33 – 39.
4. Кузьмініч, Т.В. Тэорыя бібліяграфіі : тэксты лекцый [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.
5. Кузьмініч, Т.В. Працы па гісторыі Беларусі як крыніцы выяўлення першапачатковых фіксаваных форм бібліяграфічнай інфармацыі / Т.В. Кузьмініч // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. – 2001. – Вып. 4. С.5 – 23.
6. Моргенштерн, И.Г. О библиографии и информографии / И.Г.Моргенштерн // Библиография. – 1995. – № 6. – С.20 – 24.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Соколов, А.В. Социальные коммуникации. Ч.1. / А.В. Соколов. – М.: Профиздат, 2001. – С.14 – 30.
8. Фокеев, В.А. Библиографическое знание и библиографическая информация / В.А.Фокеев // Библиография. – 1993. – № 1. – С.33 – 41.
9. Фокеев, В.А. Природа библиографического знания / В.А.Фокеев. – М.: Изд-во Рос. гос. б-ки, 1995. – С.5 – 38, 192 – 200.
10. Швецова-Водка, Г.Н. Библиография и знание: грани взаимодействия / Г.Н.Швецова-Водка // Библиография. – 1998. – № 1. – С.40 – 52.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЕМІНАР № 2 па тэме “ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ СТРУКТУРА БІБЛІЯГРАФІІ (БІБЛІЯГРАФІІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ/БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ВЕДАЎ)”, 2 гадзіны

***Пытанні для абмеркавання:***

1. Вызначэнне галоўных грамадскіх функцый у межах дакументаграфічнай канцэпцыі бібліяграфіі як грамадскай з’явы:
    1.1. Дваіснасць бібліяграфічнай інфармацыі.
    1.2. Суадносіны паняццяў інфармацыйныя, дакументальныя, бібліяграфічныя патрэбнасці.
    1.3. Галоўныя (унутраныя) функцыі бібліяграфічнай інфармацыі.
    1.4. Функцыянальна-генетычная і функцыянальна-лагічная структуры бібліяграфічнай інфармацыі.
    1.5. Знешнія функцыі бібліяграфічнай інфармацыі як пасрэдніка ў сістэме “дакумент-карыстальнік”.
2. Функцыі бібліяграфічных ведаў у сістэме “свет тэкстаў – свет карыстальнікаў”.
3. Спецыфічныя ўласцівасці бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфічных ведаў).

***Літаратура***

*Асноўная*

1. Берестова, Т.Ф. Законы формирования структуры информационного пространства и функции библиографии / Т.Ф. Берестова // Библиография. – 2009. – № 5. – С.32–47.
2. Вохрышева, М.Г. Теория библиографии / М.Г.Вохрышева. – Самара, 2004. – С. 21 – 24, 42–46.
3. Коршунов, О. П. Библиографоведение. Основы теории и методологии / О.П.Коршунов, Т. Ф. Лиховид, Т. А. Новоженова. –М.: ФАИР, 2011. – 336 с.
4. Кузьмініч Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя: вучэб. дапам. – Мінск : “Беларусь”, 2012. – 215 с.
5. Фокеев, В.А. Библиография: теоретико-методологические основания / В.А.Фокеев. – СПб., 2006. – С.241 – 253.

*Дадатковая*

1. Коршунов, О.П. Библиографоведение. Общий курс : учебник: в 2 ч. / О.П.Коршунов. – М., 2001. – Ч.1. – С.27 – 54.
2. Кузьмініч, Т.В. Тэорыя бібліяграфіі: тэксты лекцый [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.
3. Фокеев, В.А. Природа библиографического знания / В.А.Фокеев. – М. : Изд-во Рос. гос. б-ки, 1995. – С.38 – 89.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЕМІНАР № 3 па тэме “БІБЛІЯГРАФІЯ ЯК ГАЛІНА ДЗЕЙНАСЦІ”, 2 гадзіны

***Пытанні для абмеркавання:***

*1.Суадносіны паняццяў “бібліяграфія” і “бібліяграфічная дзейнасць” у тэрмінасістэме бібліяграфазнаўства:*

1.1. Як вызначае А.П.Коршунаў аб’ём паняцця –бібліяграфічная дзейнасць”?

1.2. Як вызначае М.Г.Вохрышава аб’ём паняцця –бібліяграфічная дзейнасць”?

2. Прынцыпы бібліяграфічнай дзейнасці.

3. Заканамернасці бібліяграфічнай дзейнасці.

4. Структура бібліяграфічнай дзейнасці:

4.1. Унутраная (кампанентная) структура: характарыстыка суб’ектаў, аб’ектаў, працэсаў, мэт, сродкаў і іншых кампанентаў.

4.2. Знешняя (відавая) структура: па грамадскім прызначэнні, функцыянальна-мэтавым прызначэнні, змесце.

***Літаратура***

*Асноўная*


1. Библиографическая деятельность // Библиотечная энциклопедия. – Рос. гос. б-ка. – М., 2007. – С.89 – 90.
2. Вохрышева, М.Г. Теория библиографии / М.Г.Вохрышева. – Самара, 2004. – С. 49–65, 99 – 135.
3. ГОСТ 7.0-99. СИБИД. Информационно-библиотечная деятельность, библиография: Термины и определения. – Введ. 1.06.2000. – Мн.: Белстандарт, 1999. – 23 с.
4. Коршунов, О. П. Библиографоведение. Основы теории и методологии / О.П.Коршунов, Т. Ф. Лиховид, Т. А. Новоженова. –М.: ФАИР, 2011. – 336 с.
5. Кузьмініч Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя: вучэб. дапам. – Мінск : –Беларусь”, 2012. – 215 с.
6. Фокеев, В.А. Библиография: теоретико-методологические основания / В.А.Фокеев. – СПб., 2006. – С. 220–240.


*Дадатковая*


1. Коршунов, О.П. Библиографоведение. Общий курс : учебник. – М., 1990. – С. 65 –128.
2. Кузьмініч, Т.В. Тэорыя бібліяграфіі: тэксты лекцый [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Леонов, В.П. О личности и мастерстве библиографа / В.П.Леонов // Мир библиографии. – 2008. – № 1. – С.2 – 5.
4. Профессиональная среда библиографа // Справочник библиографа. – 2-е изд., перераб и доп. – СПб., 2003. – С.519 – 524.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЕМІНАР № 4 па тэме "РАЗВІЦЦЁ БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ", 2 гадзіны

***Пытанні для абмеркавання:***

*1. Парадыгма як навуковая з'ява ў бібліяграфазнаўстве.*

2. Вядучыя тэндэнцыі сучаснага этапа развіцця бібліяграфазнаўства.

3. Асноўныя сучасныя канцэпцыі бібліяграфазнаўства:

   3.1. Дакументаграфічная (інфармацыйна-дакументаграфічная) канцэпцыя.

   3.2. Інфармацыйна-кнігазнаўчая (кнігаграфічная) канцэпцыя.

   3.3. Ідэаграфічная (інфармаграфічная) канцэпцыя.

   3.4. Кагнітыўна-камунікацыйная) канцэпцыя.

   3.5. Культуралагічная канцэпцыя.

   3.6. Інфармацыйна-управленчая канцэпцыя.

   3.7. Когнітаграфічная (―знаниевая") канцэпцыя.

   3.8. Навуказнаўчая канцэпцыя.

4. Ці згодны Вы з высновамі Т.А.Наважонавай? (№ 6 а/л)

***Літаратура***

*Асноўная*


1. Библиографическая деятельность // Библиотечная энциклопедия. – Рос. гос. б-ка. – М., 2007. – С.89 – 90.
2. Вохрышева, М.Г. Теория библиографии / М.Г.Вохрышева. – Самара, 2004. – С. 183 – 200.
